Ігар Сідарук

# МОЎКНАСЬЦЬ

Вершы

KAMUNIKAT.org

Выдавецтва С. Лаўрова
Берасьце
1977 г.

* * *
Паглядзі,
як заходзіць сонца.

Яно мёртвае,
тваё сонца.

За захадам – захад. Зыход…

9.05.95

* * *
недзе –
вішні,
белыя вішні…

І так ціха
на маёй радзіме.

Аж страшна.

9.05.95

* * *

Не кранай…
Не кранай тое, што мае сэнс.

Ціха
засьні
л я  м я ж ы …

9.05.95

* * *

пачакай
распранацца:

тут
мора валошкаў

згарэлых…

9.05.95

* * *

выстылі вочы твае
ходзяць па хаце прыхадні
куранятак хапаюць
маленькіх
такіх
як ты

хоць ты ўжо – ня ты
у вочы – ня вочы
бо

і холад скончыўся
і хата незамкнёная
і ў калодзежы
поўна попелу

12.05.95

* * *

будзеш
ісьці па сьлядах сваіх
азірацца
наперад

будзеш бачыць
сябе
што ішоў
тут
пачакай

іншы шлях
не шукай
сам

12.05.95

* * *

ты
любіш мае пацалункі
ты гаворыш:
“цалаваньне як дараваньне”
твой пацалунак – унутр

дарыць –
надзею
дараваць – гаркату

і як найсьмялейшы дар –
забываць

11.05.95

* * *

твой голас!
што зробіш:
чуюць глухія

нехта
ратопча абцасам
твой
голас

24.05.95

* * *

я ў чорныя строі
ўбіраю свой дом
свае вочы
прадаю
чорныя кошыкі
купіце
заплаціце напоўніцу!

каб бачыць
белае
каб ня бачыць
сьляпое неба

24.05.95

* * *

і няма болей слоў
нават слоў якіх не было
няма таксама

моўкнае
адхланьне…

“ад пáхаў
пáхаў!..”

хоць бы смьерці
але на волі

11.05.95

* * *

бацька
сьсівелы мой бацька

радасьць
мы былі побач
дакрануцца і зразумець
немагчыма

9.05.95

* * *

ложак сьпявае
хоць толькі кветкі
на ложку

ў старэнькім гатэлі
дзе цёплы душ
і вулічны пах сьнегу

там сьмех
там гульня ў каханьне
гульня па правілах
болю…

9.05.95

* * *

нож
у сьпіну
каханай

зарасьце травою
крывёю

называла сукенку
“зарой вечаровaю”

на зары
аб нож абламалі
свае іклы зьвяры

4.06.95

* * *

суніцы
там былі суніцы
і так мала расьціснутых

самагубца іх еў…

4.06.95

* * *

добра
там
дзе няма нас

там
добра
а нас там няма
ўжо...

10.06.95

* * *

ты думаў што жыў
ня ўчора
а як жыў – ня думаў
і вечнасьць
банальнае слова...

хто плакаў над мёдам
той ведае смак
іншы

таму я прашу мілы
так цябе прашу прашу я
ніколі ня плач
над мёдам

8.06.95

* * *

а яны ж галодныя
а яны ж халодныя…

ня будзь такім –
ніякім:
ты ня зможаш

12.05.95

* * *

верш напісаны
думаеш: азірнуўся

папера як сьнег
зьнямелы –
выпаліць вочы
і ня будзеш бачыць
сябе

10.06.95

* * *

гэта вернецца
ня ўчуеш нават –
а ўжо:
сьпіш дома
яблыкі ў палынах
сьвецяцца

на золку ламота ў зубах
ад малака парнога
і адзінаая кропля на рушніку
што выбелены
крывёю

19-20.07.95

* * *

ня сьпі
днём
я прашу ня сьпі
а то памрэш
будзеш мёртвым
прачнесься – а ўжо не жывы

ня чуеш
ня бачыш
як цябе адпяваюць
плачуць

дзённая сьмерць нонсэнс
пах пракіслай дурноты
а ты ж не хацеў
хацеў…

27.06.95

* * *

верасень
за смугаю
вечар сабе дазволю
той
калі
будзе ціха
калі нават можна
ня можна
ніхто не пачуе
ніхто ў гэты вечар
у сонца ня стрэліць
ніхто...

27.08.95

Нізка “ЛАСТАЎКІ”

1.
у вадзе
над вадою
лілея –
як ластаўка

хоча піць
а прачнуцца ня можа
нізка-нізка ляціць

калі ў дзюбачку пацалуеш

kamunikat.org

будзеш ведаць
хто плача ў тым сьне

не?
ня бойся
не!..

у тым сьне
не прачынаюцца

5.07.95

2.
не шукай
там…

тут зірнуць ты ня можаш
а ведаеш як
ведаеш
пахнуць надкрыльлі
лёгкі пушок на іх?

лёгкі
як
мой хрып
зь перарэзаным горлам

5.07.95

kamunikat.org

3.
адляцелі ластаўкі
не вярнуліся
думаеш: “ну й!..”
а яны так ня думаюць
ім трэба
а ў цябе няма
як хораша думаюць ластаўкі!
не вярнуліся

12.05.95

4.
аб дрэва
аб чорнае дрэва...
разьбілася кроў твая
не бывае каб кроў
як птушка
і аб дрэва
не бывае нават уначы
хоць крычы
хоць чаборкавых ледунцоў
пакладзі мне ў
далонь

без крыві
стане лёгка
нібыта расьціснулі песьню
сьмейся ластаўка сьмейся!

5.07.95

5.
у вобразе вечара
дрэвы схаваліся
і птушкі ластаўкі сьпяць
не ляцяць болей

баюся
разьбіць цябе не данесьці
скласьці настроі два
немагчыма

а хочаш!
калі толькі хочаш…
калі вернесься ўраньні…

ляці, ластаўка!

27.09-3.10.95

- - - - -

* * *
зборнік вершаў назваць
імем тваім
і маўчаць думаць
пра што?
ні пра што

вершы як дождж
радкамі – косы твае

мокне прахожы адзіны
ці двое?

зборнік вершаў назваць…
і нічога болей ня ўмець
і ня памятаць болей нічога

такі ціхі дождж
моўкнасьць

3.10.05

* * *

не, восень яшчэ ня хутка –
восень ужо прайшла
і поўня такая!
адчаем напоўніцу
сьвеціць
сьцюдзёна

блытаюць ніткі старыя
што дзяцей ня мелі ніколі…

7.09.95

* * *

і нават у жніўні
калі я памру
нават у жніўні…

10.08.95

* * *

слухай як кроплі
слухай

дождж
прынясе “Ave!..”
мы ўведаем заўтра
што ну што?

тэму слухай слухай
як кроплі кроплі
кроплі слухай кроплі
заўтра (ужо прайшло).

12.05.95

* * *

...і толькі сон як заўсёды
бездакорны
ў дзень нашых слоў

16.10.95

* * *

навat вецер
прадам
калі
зялёныя вочы тваe
будуць глядзець
усё будуць глядзець
усё будуць і будуць і будуць…

28.10.95

* * *

і раптам падумаеш:
вось і жыцьцё
вось і сьмех учарашні

лёгкі
попел і пыл

не шкадуй
што кахалі цябе
што вяртаньне
на згубу на згубу…

12.10.95

* * *

а калі я зыходжу –
ты чуеш? –

калі я зыходжу
калі ўвечары спаць немагчыма
а брукаванку ўсьцілае...
не!
нават пух, нават пыл не ўсьцілае
і такі цяжкі грузавік
як палалунак у вусны
Юды

16.10.95

* * *

дай у вочы твае...
Божа!
маўкліва неміласэрна дай
дотыкам непакоры
праўду сказаць
што кахаў не прызнацца...

20.09.05

* * *

...а яшчэ я табе раскажу
як закахаўся ў цябе
як баяўся й лісты хаваў
што пісаў ноччу
і чытаў
сабаку
а ён –

(замест тваіх пацалункаў) –
твар мне лізаў…

“Шкада, - гаварыў ён. –
шкада, што ні ты…
ні яна…
што ніколі
бо тут
нават “ніколі” ужо сэнсу ня мае”.

7.09.95

* * *
чыстыя аркушы

блытаніна ўчынкаў

хтосьці
ўчарашні
паліць заўтрашні сьнег
пальцы мне апякае

7.09.95

* * *
і нават кава
ўжо ня грэе
ты сьлёзы навошта
не было веры

а вецер?
ён нас цалаваў лашчыў
і вясёлы паэт як заўсёды
ў пошуках суму
тэлефон нябярэ
і
пачуўшы адказ
не пачуе

27.09.05

* * *

там на вуліцы
дзе сонца няшмат
аранжыкі прадаюць
там плачуць убогія

там жанчына
мрою сваю
як міласьціну кладзе:
“маліцеся!”

і зыходзіць туды дзе аранжыкі
дзе сонца няшмат
і дзе той, за каго…
а вечарам
будуць піва піць зь верай убогія
памаліцца – ня змогуць

4.10.95

* * *

згустак хлусьні
і вока –
чыстае бы ў дзіцяці

спляжаны нацюрморт
пазачарговага выкананьня
твайго абавязку памерці

27.08.95

* * *

ты любіў сьнег
а ўзьвёў эшафот
на белым…

каб потым

і шкадаваць і плакаць
і рагатаць ашалела

10.08.95

* * *

ноч
адна толькі ноч
час калі можна думаць
калі можна чакаць
безадчайна

адзіную,
хто прыходзіць
хто ўжо не прыходзіць
не.

10.08.95

* * *

хутка восень
шэра
ўжо схаваліся ў сукні жанчыны
і толькі звон
толькі трэснуты звон
б”е
яшчэ чуе
ні па кім не жадае званіць

10.08.95

* * *

багі не сьпяць
багі ня плачуць
яны сьлёзы ня лічаць за сьлёзы
ты
рукі памыўшы
сьняданак адрынуць ня можаш

10.08.95

* * *

пэўна ты чула
як я
адное імя тваё
перад храмам рамонкавым
перад узвышшам гаркоты

хоць і сьвіньняў шмат
хоць і рохкаюць

ды толькі храм
толькі
імя

20.09.95

* * *

калі ў цябе ёсьць вецер…
калі ў цябе ёсьць…
калі…

11.05.95

kamunikat.org